іншыЯ

# Як справы ў сферы інклюзіі?

Ацэнка сітуацыі ў галіне інклюзіі для беларускіх арганізацый і ініцыятыў на пачатак 2023 года

Арганізацыя «ІншыЯ», 2023

# Як збіраліся дадзеныя

Пандэмія COVID-19, палітычныя пратэсты, некалькі хваляў рэпрэсій і эміграцыі, вайна — усё гэта паўплывала і працягвае ўплываць на ўсіх нас, а таксама на нашую працу ў галіне інклюзіі*.

***Інклюзія** *для нас — гэта стварэнне ўмоў і працэс уключэння розных уразлівых груп у жыццё грамадства.*

Арганізацыя «ІншыЯ» на пачатку красавіка 2023 года правяла ў Літве форум «All Inclusive 2.0. Стратэгіі працы ў сучасных умовах». Для падрыхтоўкі Форума мы запусцілі форму для ацэнкі сітуацыі ў сферы інклюзіі, якая склалася ў Беларусі з вясны 2020 года. Запоўніць форму запрашаліся беларускія арганізацыі і ініцыятывы, для якіх інклюзія з'яўляецца кірункам працы альбо каштоўнасцю.

Апытанне праводзілася ў перыяд ***з 5 па 23 студзеня 2023*** праз інтэрнэт. Мы распаўсюджвалі форму адкрыта праз тэматычныя рассылкі, чаты і каналы, сайты і сацсеткі розных арганізацый і ініцыятыў, а таксама асабіста запрашалі людзей прыняць удзел у апытанні.

Агулам мы атрымалі ***47 адказаў***. Па выніках аналізу, мы зразумелі, што атрыманыя дадзеныя могуць быць цікавыя і карысныя не толькі нашай арганізацыі для падрыхтоўкі Форума і рэалізацыі нашай місіі, аднак і іншым арганізацыям, ініцыятывам, актывістам_кам для вядзення дзейнасці ў галіне інклюзіі.

!

*Дадзенае апытанне запускалася як ацэнка патрэбаў і* ***не з'яўляецца рэпрэзентатыўным даследаваннем.*** *Вынікі гэтага апытання могуць недакладна адлюстроўваць сітуацыю ў галіне інклюзіі. Аднак, пасля прэзентацыі вынікаў на Форуме і кансультавання з даследчыкамі_цамі мы можам сцвярджаць, што вынікі апытання ў той ці іншай ступені адлюстроўваюць агульныя тэндэнцыі, якія назіраюцца ў сектары інклюзіі і могуць выкарыстоўвацца для прыняцця рашэнняў аб дзейнасці ў гэтым сектары.*

# Агульная інфармацыя пра рэспандэнтаў_ак

57% рэспандэнтаў_ак (альбо 27 чал.) знаходзяцца па-за межамі Беларусі. Што сярод іншага можа сведчыць пра тое, што палітычныя рэпрэсіі не абмінулі сектар інклюзіі і інклюзіўнай працы. У той жа час амаль 43% (альбо 20 чал.) знаходзяцца ў Беларусі. Верагодна, у тым ліку праз тое, што з некаторымі ўразлівымі групамі найбольш эфектыўна і якасна працаваць магчыма толькі знаходзячыся там жа, дзе і яны.

**Дзе цяпер знаходзіцеся вы альбо асноўная каманда вашай арганізацыі/ініцыятывы?**

*47 адказаў*




Большасць рэспандэнтаў_ак (75% альбо 35 чал.) працуюць з тэмай больш за 3 гады, чвэрць мае да 3 гадоў досведу (25% альбо 12 чалавек), з іх толькі двое маюць досвед працы з тэмай да 1 году.

**Як доўга вы працуеце ў галіне інклюзіі?**

*47 адказаў*




**Пры адказе на пытанне можна было рабіць множны выбар, таму выніковыя % і агульныя лічбы перавышаюць 100% ці 47 удзельнікаў_ц апытання.*

Большасць людзей працуе з тэмай інклюзіі ў складзе арганізацыі (57% альбо 27 чал.) і/альбо ініцыятывы (43% альбо 20 чал.), 32% (альбо 15 чал.) працуюць з тэмай індывідуальна. Толькі 1 з 10 чалавек працуе з тэмай выключна індывідуальна. Кожн_ая 4-ты чалавек сумяшчае працу ў арганізацыі і ініцыятыве альбо працу ў арганізацыі ці ініцыятыве і індывідуальны актывізм.

Толькі 19% (альбо 9 чал.) адзначылі, што працуюць з 1-2 уразлівымі групамі, у той час як іншыя 81% (альбо 38 чал.) працуюць як найменш з 3 групамі. Пятая частка рэспандэнтаў_ак (21% альбо 10 чал.) адзначыла, што працуе не менш чым з 6 групамі.

Кожны 2-гі/-гая адзначылі, што працуюць з жанчынамі, моладдзю і ЛГБТК+ людзьмі. 42% працуе з людзьмі з псіхічнымі разладамі. Дадаткова называлі такія групы як: дзеці, залежныя і сузалежныя людзі (алкаголь, наркотыкі), жыхары з аддаленых тэрыторый / рэгіёнаў (малых гарадоў і сельскай мясцовасці), анкапацыенты_кі, палітвязні і людзі, пацярпелыя ад рэпрэсій і катаванняў альбо якія могуць патрапіць пад рэпрэсіі.




**Памер і яскравасць колеру залежаць ад таго як часта адзначалі групу ў апытанні: чым больш людзей адзначыла, тым цямнейшым і большым шрыфтам напісана група.*

# Ацэнка сітуацыі ў сферы інклюзіі

## Як вы агулам ацэньваеце змену сітуацыі ў галіне інклюзіі ў Беларусі пасля вясны 2020 году?

62% рэспандэнтаў_ак (альбо 29 чал.) адзначылі, што сітуацыі (значна) пагоршылася, 19% (альбо 9 чал.) лічаць, што сітуацыя прыкладна такая ж і толькі 4% (альбо 2 чалавекі) лічаць, што сітуацыя палепшылася. Ніхто не адзначыў, што сітуацыя значна палепшылася. 15% (альбо 7 чал.) адзначылі, што ім складана ацаніць сітуацыю. Ацэнкі людзей, якія знаходзяцца ў Беларусі і выехалі з краіны, значна не адрозніваюцца.

**Як вы агулам ацэньваеце змену сітуацыі ў галіне інклюзіі ў Беларусі пасля вясны 2020 году?**

*47 адказаў*




## Як вы ацэньваеце сваю працу ў галіне інклюзіі ў Беларусі пасля вясны 2020 году?

Палова рэспандэнтаў_ак (51% ці 24 чал.) працуюць прыкладна столькі ж ці нават больш. Людзі, якія выехалі з краіны, часцей адказваюць, што сталі працаваць больш (37% супраць 25% сярод тых, хто знаходзіцца ў Беларусі).
21% (альбо 10 чал.) сталі працаваць менш, а 15% (альбо 7 чал.) наогул спынілі сваю працу ў гэтай галіне (часцей так адказвалі тыя, хто знаходзіцца ў Беларусі).
6% (альбо 3 чал.) пачалі працу ў гэтай сферы пасля вясны 2020. Столькі ж адзначылі, што ім цяжка ацаніць гэта (усе знаходзяцца па-за межамі Беларусі).

**Як вы ацэньваеце сваю працу ў галіне інклюзіі ў Беларусі пасля вясны 2020 году?**

*47 адказаў*



## Чым вы ці вашая арганізацыя/ініцыятыва займаліся ў галіне інклюзіі да вясны 2020 і на дадзены момант?

Да вясны 2020 года двума асноўнымі кірункамі працы (адзначыла палова рэспандэнтаў_ак) былі асвета ў галіне інклюзіі (49%) і інфармацыйная падтрымка мэтавых груп (49%). Траціна рэспандэнтаў_ак адзначылі, што займаліся адукацыяй у галіне інклюзіі, а чвэрць юрыдычнай, псіхалагічнай ці кансультацыйнай падтрымкай ды іншай наўпроставай працай з мэтавымі групамі. Адзін чалавек адзначыў, што займаўся стварэннем інфраструктуры.

На пачатак 2023 года амаль усімі кірункамі працы (акрамя інфармацыйнай падтрымкі) займаецца менш рэспандэнтаў_ак, чым гэта было да вясны 2020. У лідарах па-ранейшаму інфармацыйная падтрымка мэтавых груп, крыху менш людзей адзначыла асвету ў галіне інклюзіі, ***іншую наўпроставую працу з мэтавымі групамі і кансультацыйную падтрымку***. У сваю чаргу менавіта два апошнія кірункі працы назвалі ў 1,5 разы больш рэстандэнтаў_ак у параўнанні з 2020 годам, то бок іх аб'ём змяніўся найбольш значна з усіх кірункаў працы. Павелічэнне кансультацыйнай працы можна, верагодна, растлумачыць значнай зменай абставінаў і неабходнасцю такога віду дапамогі для адаптацыі жыцця мэтавых груп да новых умоваў. У той жа час павелічэнне іншай наўпроставай працы растлумачыць цяжэй, бо не да канца зразумела што менавіта людзі мелі на ўвазе, калі адзначалі гэты варыянт. Магчыма, гэта гуманітарная дапамога (адзенне, прадукты, лекі, жытло), якая патрэбна ў перыяд пагаршэння эканамічнага стану для ўразлівых груп і з-за павелічэння патрэбы ў такой дапамозе большая колькасць арганізацый/ініцыятыў была вымушана ўзяць на сябе такі кірунак працы. Магчыма, гэта таксама можна растлумачыць тым, што з'яўляюцца новыя ўразлівыя групы, з якім арганізацыі/ініцыятывы распачынаюць працу і таму ўказваюць гэты кірунак.

## З якімі складанасцямі вы ці вашая арганізацыя/ініцыятыва сутыкаецеся ў галіне інклюзіі на дадзены момант?

Сыходзячы з адказаў рэспандэнтаў_ак можна зрабіць выснову, што для іх ***актуальныя тыя ж складанасці, якія актуальныя і для іншых АГС***, напрыклад, немагчымасць доўгатэрміновага планавання працы (72%) і ўскладненне доступу да мэтавых груп (60%; гэты варыянт часцей абіралі тыя, хто знаходзіцца за мяжой). Таксама актуальнай перашкодай з'яўляецца тое, што мэтавыя групы баяцца ўзаемадзейнічаць з арганізацыямі/ініцыятывамі (51%). Значная частка рэспандэнтаў_ак адзначаюць праблемы з фінансамі: 43% лічыць, што зменшылася колькасць крыніц фінансавай падтрымкі, 34% — памеры фінансавай падтрымкі. Людзі, якія знаходзяцца ў Беларусі, у два разы часцей адзначалі гэтыя праблемы ў параўнанні з тымі, хто знаходзіцца за мяжой. 2 чалавекі наўпрост напісалі, што прама зараз шукаюць фінансаванне для сваёй працы.

36% (альбо 17 чал.) адзначылі, што тэма інклюзіі стала менш актуальнай у публічнай сферы. Такі варыянт у два разы часцей адзначалі тыя, хто выехаў з Беларусі. У дадатковых каментарыях было адзначана, што *«Для герояў і арганізацый з Беларусі стала немагчымым супрацоўніцтва з незалежнымі СМІ. Бо яны амаль усе "экстрэмісцкія фармаванні", і людзі могуць патрапіць на крымінальны тэрмін за садзейнічанне экстрэмізму. А гісторыі ад ананімных аўтараў пра ананімных герояў выклікаюць значна менш эмоцый і падтрымкі»*.

Каля 28% адзначаюць, што дзяржаўныя органы не адказваюць на іх запыты альбо інакш указваюць, што (су-)праца і/ці камунікацыя з дзяржавай зараз спынена. У два разы часцей гэта адзначалі тыя, хто знаходзіцца ў краіне.

Дадаткова 13% (альбо 6 чал.) адзначылі розныя аспекты, якія звязаныя з небяспекай і тое, што працаваць зараз агулам небяспечна, і тое, што ліквідацыя арганізацыі моцна паўплывала на бяспечнасць працы, і тое, што за працу зараз можна патрапіць пад рэпрэсіі. Такія адказы часцей давалі людзі, якія знаходзяцца ў Беларусі.

Каментуючы адказы на свае пытанні рэспандэнты_кі таксама казалі пра негатоўнасць дзяржаўных арганізацый да працы з людзьмі з інваліднасцю замест НКА, бо працы вельмі шмат. Таксама адзначалі, што камунікацыя з дзяржорганамі ніколі не была добрай.

## Чаго вам не хапае для эфектыўнай працы ў галіне інклюзіі на дадзены момант?

**ТОП-5 адказаў**

62% — Мерапрыемстваў для абмену досведам з іншымі арганізацыямі/ініцыятывамі
53% — Актуальнай інфармацыі пра стан стыгматызаваных і дыскрымінаваных груп
47% — Актуальнай інфармацыі пра стан галіны ў Беларусі
45% — Новых прыкладаў інклюзіўных практык працы
40% — Інфармацыі пра тое, хто цяпер працуе з тэмай інклюзіі

Недахоп актуальнай інфармацыі пра стан стыгматызаваных і дыскрымінаваных груп і стан галіны ў Беларусі ў два разы часцей адзначалі тыя, хто выехаў з Беларусі.

36% рэспандэнтаў_ак адзначылі, што не хапае адукацыйных мерапрыемстваў, што сведчыць пра наяўнасць пэўнага запыту ў тэме (людзі ў Беларусі адзначалі гэты запыт крыху часцей).

30% адзначылі, што не хапае інфармацыі пра тое, ***як цяпер працаваць*** з тэмай інклюзіі, што на фоне папулярнасці іншых адказаў сведчыць хутчэй пра тое, што ў большасці АГС усё ж ёсць разуменне таго, як зараз працаваць з тэмай. Пры гэтым тыя, хто знаходзіцца па-за межамі Беларусі, у 2,5 разы часцей адзначалі, што ім не хапае такой інфармацыі (фактычна гэта адзначылі кожны_ая другі_ая, хто знаходзіцца не ў Беларусі і толькі 1 з 10 сярод тых, хто жыве ў краіне).

Сярод адказаў «Іншае» адзначалі фінансавыя сродкі, ***адпачынак і маральную падтрымку***, бяспеку, яснасць з тым што легальна, а за што можна патрапіць пад крымінальны пераслед і, канешне, ***магчымасць рэальнай працы ўнутры Беларусі***. Асобна варта адзначыць каментар пра неабходнасць выязных сустрэчаў (рэспандэнт_ка з Беларусі): «*Праз тое, што шмат актывістаў і актывістак з'ехалі, вельмі патрэбныя выязныя сустрэчы, каб людзі, якія жывуць як унутры, так і па-за межамі Беларусі маглі заставацца ў кантакце*».

## Што больш за ўсё ўплывае на вашую працу ў галіне інклюзіі ў дадзены момант?

Гэта было ***адкрытае пытанне***, на якое можна было даць абсалютна любы адказ. Большасць адказаў была пра нешта негатыўнае і толькі некалькі адказаў былі пра пазітыўныя рэчы (напрыклад, пра асабістую матывацыю, падтрымку з боку калег ды каляжанак, наяўнасць досведу).

Сярод найбольш папулярных адказаў можна вылучыць дзве вялікія групы:

1. Каля 60% складаюць адказы, якія ўтрымліваюць спасылкі на страх і небяспечнасць працы ўнутры Беларусі: гэта і пра страх затрымання, і пра агульны страх ад сітуацыі небяспекі ў краіне, адсутнасць даверу ў грамадстве, немагчымасць легальнай і адкрытай працы (публічнасці), рэпрэсіі, якія павялічваюцца, ціск з боку дзяржавы, прызнанне інфармацыйных рэсурсаў экстрэмісцкімі, небяспечнасць камунікацыі з актывістамі_камі ўнутры Беларусі. Гэтыя адказы значна часцей называлі людзі, якія жывуць у краіне.
2. Каля 32% складаюць адказы, якія звязаныя з рознымі аспектамі працы з мэтавай аўдыторыяй: як з ёй зараз бяспечна працаваць, дзе яе шукаць, бо быў страчаны прамы доступ і адпаведна аўдыторыя не дасяжная, аўдыторыя баіцца ўдзельнічаць у актыўнасцях АГС. Сюды ж адносяцца адказы пра працу з патрэбамі мэтавай аўдыторыі і агульную неабходнасць працы менавіта з такой аўдыторыяй, бо ёй зараз гэта неабходна. Гэтыя адказы часцей давалі людзі, якія жывуць па-за межамі Беларусі.

Значная колькасць адказаў (каля 19%) звязана з вымушаным знаходжаннем па-за межамі Беларусі і ўплывам гэтага стану на працу з інклюзіяй.

Такая ж колькасць адказаў (каля 19%) звязаная з фінансавымі аспектамі: неадпаведнасць заробку і ўкладзенага часу, адсутнасць фінансавання, немагчымасць бяспечна атрымаць яго ў Беларусь.

Значная колькасць адказаў (каля 15%) звязаная з выгараннем як асноўнай каманды арганізацыі, так і валанцёраў_ак, зніжэннем матывацыі. Некалькі рэспандэнтаў_ак наўпрост адзначалі, што ім не хапае людзей у камандзе.

Сярод іншых акалічнасцяў, якія ўплываць зараз на працу найбольш таксама адзначаліся: немагчымасць планавання, адсутнасць публічных падзей у Беларусі, цяжкасці з выездам, адсутнасць супрацоўніцтва ўнутры краіны, а таксама розныя асабістыя прычыны, якія вядуць да змяшчэння прыярытэту на іншыя сферы працы.

## Ці з'явіліся ў вас з вясны 2020 новыя практыкі працы ў галіне інклюзіі?

Большасць рэспандэнтаў_ак (38% альбо 18 чал.) не змяняла свае практыкі і карыстаюцца тымі, што ведалі раней. 32% пачалі выкарыстоўваць новыя практыкі. Аднак 15% нават спынілі выкарыстоўваць тыя, што рэалізоўвалі раней. 6% наогул не карыстаюцца інклюзіўнымі практыкамі.

Сярод прыкладаў новых практык хутчэй называюцца не самі практыкі, а праца з новымі для арганізацыі мэтавымі групамі, новыя фарматы працы (напрыклад, адвозяць мэтавым групам да дому неабходныя лекі, вакцынацыя ад COVID-19 на базе арганізацыі), распрацоўка гендарнай палітыкі, ананімізацыя герояў, пачатак працы ў TikTok.

# Замест высноў

Падзеі 2020-2022 моцна паўплывалі на дзейнасць і стан арганізацый, ініцыятыў і актывістаў_ак у галіне інклюзіі. Некаторыя праблемы з'яўляюцца агульнымі, некаторыя больш актуальныя для тых, хто жыве ў Беларусі альбо для тых, хто быў вымушаны выехаць з краіны.

Прыведзеныя вышэй дадзеныя — вынік ацэнкі патрэбаў, а не паўнавартаснае даследаванне. Атрыманыя дадзеныя нельга лічыць рэпрэзентатыўнымі. Аднак, мы ўпэўненыя, што яны ў большай ці меншай ступені адлюстроўваць рэальна існуючыя трэнды ў сектары інклюзіўных арганізацый і ініцыятыў. Мы хочам, каб гэтыя вынікі былі карысныя не толькі для нашай арганізацыі, але і дапамаглі розным актарам лепш зразумець стан сектара інлюзіўных арганізацый і спланаваць дзеянні па яго ўмацаванню.

**Разам да інклюзіўнай Беларусі!**

## Кантакты

іншыЯ

Усе пытанні адносна вынікаў апытання вы можаце задаць нам па пошце info@theothersby.org з пазнакай у тэме ліста «Як справы ў сферы інклюзіі?»


Рассылка

@theothersby

info@theothersby.org

www.theothersby.org